Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынга

# Хроніка

## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2014 г.

### *Мерапрыемствы ў рамках абласнога месячніка<br>“Бібліятэка аграгарадка – пошук уласнага аблічча”*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу створаны электронны праспект аб бібліятэках аграгарадкоў Кобрынскага раёна “Семнадцать – в одном”, дзе размешчаны даведачныя, інфармацыйныя, фактаграфічныя матэрыялы, фотаздымкі бібліятэчнага жыцця аграгарадкоў.

*2 красавіка*

Кніжнае свята “З табою, кніга добрая, ідзем у новы век”. Свята суправаджалася мультымедыйнай прэзентацыяй. Падрыхтавана паведамленне аб кнізе: гісторыя ўзнікнення, цікавыя звесткі аб першадрукарах. Праведзены віктарыны, конкурсы. Самыя актыўныя атрымалі прызы.

*Стыгаўская СБ, 21 чал.*

*3 красавіка*

Дзень інфармацыі для моладдзі і падлеткаў “Хідры – старонкі жыцця”. Карыстальнікі мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца як з мінулым, так і з сучасным жыццём сваей вёскі.

*Хідрынская СБ, 15 чал.*

*12 красавіка*

Дзень адчыненых дзвярэй “Дзіцячай кнізе – чароўны свет”. Школьнікам прапанавана экскурсія па бібліятэцы і мультвіктарына, прадстаўлены навінкі перыядычных выданняў. Адбылося ўшанаванне лепшых чытачоў, праведзены гульні і конкурсы.

*Дзівінская ДБ, 40 чал.*

*13 красавіка*

Дзень адчыненых дзвярэй. У праграме:

- бібліяподыум “Шаг навстречу читателям”, на якім актыўныя чытачы расказвалі пра свае любімыя кнігі;
- выстава – падзяка “Адкрыты стэлаж”, прысвечаная чытачам, якія падарылі свае кнігі бібліятэцы;
- фотавыстава “К книге и чтению – через досуг и общение”.

*Арэхаўская СБ, 21 чал.*

*20 красавіка*

Дзень адчыненых дзвярэй “Калі хочаш ведаць край – у бібліятэку завітай”. Прапанавана выстава – прагляд “Путешествуйте с нами, путешествуйте сами”, электронная прэзентацыя “Шагая па роднаму краю”. Знаёмства з кутком старажытнага побыту, які арганізаваны ў бібліятэцы.

*Восаўская СБ, 29 чал.*

*23 красавіка*

Свята чытацкіх захапленняў “Моя читающая биография”. Афармлена кніжная выстава “Гостям всегда мы рады”. Прысутным прапанаваны прагляд электроннай прэзентацыі “Я тут жыву, і край мне гэты дарагі”. Аб сваёй чытацкай біяграфіі расказала Бондарава В. Р. – чытач з 60-ці гадовым стажам і самы актыўны дзіцячы чытач – Насця Сахарчук, якая чытае ўжо ў бібліятэцы 5 гадоў.

*Навасёлкаўская СБ, 15 чал.*

**_Мерапрыемствы да Дня Чарнобыльскай трагедыі_**

*25 красавіка*

У сярэдняй школе №3 адбылося выступленне ЛПГ "Рытм" цэнтральнай раённай бібліятэкі "Имя той звезде - Полынь". Асноўная мэта мерапрыемства: нагадаць пра тое, чаго забываць нельга: пра Чарнобыль, яго героях, ўроках страшнай трагедыі. У праграме:

- літаратурна - паэтычная кампазіцыя "Чарнобыль: рэха трагедыі"
- кніжная выстава "Чарнобыль: мужнасць і памяць"
- віктарына "Наступствы чарнобыльскай катастрофы"

*ЦБ, 50 чал*

**_Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароў'я_**

*17 красавіка*

Пазнавальная гадзіна для маленькіх карыстальнікаў па здароваму ладу жыцця і экалогіі "Винни-пух и семь чудес мёда". Дзеці азнаёміліся з такім чароўным дарам прыроды, як мёд і даведаліся аб яго лекавых уласцівасцях.

*Акцябрская СБ, 11 чал.*

*19 красавіка*

Урок здароў'я "Жизнь требует движения". На працягу мерапрыемства шла гаворка аб патрэбнасці кожнага займацца фізічнай культурай, вялася работа з прысутнымі - "пытанне-адказ". Праведзены віктарыны і спартыўныя гульні на вуліцы, самым актыўным удзельнікам уручаны прызы.

*Шамятоўская СБ, 21 чал.*

*19 красавіка*

Пазнавальная гадзіна "Лекі для здароў'я". Арганізавана кніжная выстава "Дамашняя аптэка". На мерапрыемстве прысутнічала фельшар в. Магдалін – Куцішка Т.Л., якая расказала ўдзельнікам аб здаровым ладзе жыцця.

*Магдалінская СБ, 11 чал.*

*20 красавіка*

Адкрыты прагляд літаратуры "Здоровая семья – здоровая нация". Прагучалі вершы аб здаровым ладзе жыцця. Прадстаўлены выданні па прапагандзе здаровага ладу, прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі, шкодных звычках. Размажанне дзяцей на тэму суправаджаліся гульнямі, конкурсамі. Пераможцы атрымалі дыпломы.

*Балоцкая СБ, 15 чал.*

*23 красавіка*

Вандроўка ў краіну "Ароматерапия". Расказ аб тым, як выкарыстоўваецца ароматэрапія ў сучаснай медыцыне. Гульня "Верите ли, вы?" – аб выкарыстанні прыродных рэсурсаў у медыцыне.

*Балоцкая СБ, 15 чал.*

*25 красавіка*

Пазнавальная гадзіна "Дым, уносящий здоровье". Была оформлена выстава "Курить - совсем не модно". Удзельнікі мерапрыемства дыскутавалі на тэму "Стоит ли играть со Спайсом" і адказвалі на пытанні віктарыны "Мифы о Спайсе".

*Гарадзецкая СБ, 20 чал.*

**_Іншыя мерапрыемствы_**

*5 красавіка*

Пасяджэнне клуба "Курсор"- час карыснай інфармацыі. Удзельнікі клуба мелі час пазнаёміцца з магчымасцямі новых тэхналогій. Быў зроблены медыяагляд інтэрнэт-рэсурсаў ў дапамогу школьнікам старэйшых класаў.

*Батчынская СБ, 17 чал.*

*6 красавіка*

Пазнавальна-літаратурная праграма “В гостях у Гоголя”. Расказ аб жыцці і творчасці пісьменніка. Прапанавана кніжная выстава “Гоголь  и его эпоха”, праведзена віктарына.

*Аніскавіцкая СБ, 11 чал.*

Свята птушак “Пернатые друзья”. Арганізавана выстава-прагляд “Птичьи странички”, на якой былі прадстаўлены кнігі пра птушак, а таксама малюнкі дзяцей “Беражыце птушак”. Удзельнікі клуба “Мастацкае слова” правялі конкурсы, віктарыны, гульні. Пераможцы атрымалі салодкія прызы.

*Тэвельская СБ, 15 чал.*

*11 красавіка*

У цэнтральнай бібліятэцы прайшоў раённы семінар «Інавацыйны падыход да работы сельскіх бібліятэк па ваенна-патрыятычнаму выхаванню». У межах семінара адбылася прэзентацыя віртуальнай кніжнай выставы «Солдат пера и правды», прысвечанай  90-гадоваму юбілею В.Быкава, прадстаўлены буктрэйлеры «И память о войне нам книги оживляют», падрыхтаваны медыяагляд  інтэрнэт-рэсурсаў у дапамогу рабоце бібліятэк да 70-годдзя Вялікай Перамогі і г. д.

*ЦБ, 50 чал.*

*19 красавіка*

Праваслаўная гадзіна  “Пасхальная радасць”. У праграме:

- кніжная выстава “Віншуем з Пасхай”;
- выступленне ЛПГ з пасхальнымі вершамі;
- выступленне святара і асвячэнне пасхальных страў;
- гульні “Катанне яек”, “Моцнае яйка”.

*Гайкоўская СБ, 43 чал.*

## *Выдавецкая дзейнасць*

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу была створана віртуальная кніжная выстава «Солдат пера и правды», прысвечаная 90-гадоваму юбілею Васіля Быкава.

*Выканаўца Т. І. Мілашук*